***Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт***

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка (БДПУ). Заснаваны ў Мінску ў 1922 як педагагічны факультэт БДУ, з 1993 сучасная назва.

Дысцыпліны фалькл.-этнаграфічнага цыкла найбольш чытаюцца на факультэтах гістарычным, бел. філалогіі і культуры, рускай філалогіі. музычна-педагагічным нар. культуры, супрацоўнікамі кафедраў этналогіі і фалькларыстыкі, тэорыі і гісторыі культуры. У 1994 адкрыты факультэт нар. культуры (дэкан – прафесар А. Рагуля, з 1996 М. Круталевіч). Кафедра этналогіі і фалькларыстыкі (загадчык У. Васілевіч) рыхтавала кіраўнікоў фалькл. калектываў па спецыяльнасцях "Фальклор", «Рытміка. Харэаграфія». Студэнты атрымлівалі веды на тэарэтычных і практычных занятках фальк.-этнаграфічнага цыкла. На розных кафедрах працавалі ці працуюць фалькларысты У. Васілевіч, А. Лозка, В. Сухая, Дз. Дрозд, Н. Мазурына, М. Мацюх, этнографы В. Цітоў, І. Вуглік.

***Васілевіч*** *Уладзімір Аляксандравіч* (н. 9.1.1952, Мінск), фалькларыст, этнограф. Кандыдат філалагічных навук (1979). З 1974 у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі, з 1992 у Бел. педагагічным універсітэце імя М.Танка (з 2004 загадчык кафедры этналогіі і фалькларыстыкі). Даследуе пытанні бел. фалькларыстыкі, этнаграфіі, бел. міфалогію. Аўтар манаграфіі «Усходнеславянская гумарыстычная песня» (1979), кн. «Збіральнікі" (1991); "Дай, Божа, знаць, з кім век векаваць: Беларуская народная варажба» (1993), «Міфы Бацькаўшчыны» (1994), «Беларускі народны соннік» (1996), «Стаіць цыган на золаце: Загадкі» (2001), навучальнага дапаможніка «Беларуская міфалогія» (2001). Выдаў 3-томны збор бел. нар. прыкмет і павер'яў: «Зямля стаіць пасярод свету...» (1996), «Жыцця адвечны лад» (1998), «Зямная дарога ў вырай» (1999). Збіраў фальклор у розных рэгіёнах Беларусі, запісы ўвайшлі ў тамы БНТ «Выслоўі» (1979), «Валачобныя песні" (1980), «Купальскія і пятроўскія песні» (1985), «Паэзія беларускага земляробчага календара» (1992), «Жаніцьба Цярэшкі» (1993) і інш.

***Лозка*** *Алесь (Аляксандр Юр'евіч*; 7.12.1952, в. Прыбалавічы Лельчыцкага р-на), фалькларыст, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1989). Скончыў Гомельскі універсітэт (1975). З 1987 працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі, Нац. навукова-асветным цэнтры імя Ф.Скарыны, Рэспубліканскім цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей. Аўтар кн. «Беларускі народны каляндар» (1993), "Беларускі каляндар у славянскім і еўрапейскім свеце" (2002), «Феномен Новага года ў беларускім фальклоры» (2004). Аўтар серыі кніг «Бібліятэчка народных свят і прысвяткаў": «Восеньскія святы» (1995), «Зімовыя святы" (1999), «Веснавыя святы» (2000; усе з А.Аляхновічам), "Летнія святы" (2001); «

Выбранае:

Лозка А. Ю. Крытэрыі ідэнтыфікацыі каляндарных стыляў у беларускім фальклоры // Весці БДПУ. Серыя 1. 2013. № 2 – с. 75–79.

Сярод значных прац па тэме іншых супрацоўнікаў:

Ященко В. Н. Хороводная доминанта Могилевского Поднепровья / Ященко В. Н. // Музычная культура Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы навуковай канферэнцыі, г. Мір, 31 мая 2008 года / [складальнік В. У. Дадзіёмава]. – [Б. м, друк 2008. – С. 5–18

Ященко В.Н. Хороводные версии "Стралы" на территории Могилевского Поднепровья / В. Н. Ященко // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі : навукова-тэарэтычны часопіс. – 2010. – № 16. – С. 30–35

Мазурына Н.Г. Праявы варыянтнай прыроды фальклору ў беларускіх вяснянках / Н. Г. Мазурына // Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка : матэрыялы III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 10–11 красавіка 2014 г. / [рэдкалегія: Ю. Ю. Захарына (адказны рэдактар) і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 56–58